истоков противостояния : Материалы и документы по истории общественных движений и политических партий Республики Беларусь. – 227 с.
6. Скальский, В. Влада та суспільство в Українській Народній Рєспубліці (листопад 1917 – квітень 1918 pp.) / В. Скальский // Український гісторичний збірник. – 2009. – С. 167–175.
7. Турук, Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. – М. : Типография “Под/отдела Инвалидов”, 1921. – 143 с.
8. Dsiewanowski, M. Joseph Pilsudski: A European federalist, 1918–1922 / M. Dsiewanowski. – Stanford (Calif.) : Hoover Institution Press, 1969. – XVI, 379 p.
9. Engelhardt, E. von. Weissruthenien: Volk und Land / E. von Engelhardt. – Berlin; Amsterdam; Prag; Wien : Volk und Reich, 1943. – 358 s.
10. Lubachko, I. Belorussia under Soviet Rule (1917–1957) / I. Lubachko. – Lexington : Kentucky Univ. Press, 1972. – 219 p.
11. Pipes, R. The formation of the Soviet Union. Communism and nationalism / R. Pipes. – Cambridge (Mass.) : Harvard Univ. Press, 1964. – XII, 355 p.

## ПАЛІТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ ПАМІЖ УРАДАМ БНР І ЛІТОЎСКАЙ ТАРЫБАЙ У 1918–1923 гг.

С. В. Багалейша (Мінск)

У дадзеным артыкуле мы паставілі мэту прасачаць асноўныя этапы развіцця ўзаемаадносін паміж Радай БНР і Літоўскай Тарыбай і паказаць станоўчыя і адмоўныя бакі гэтага супрацоўніцтва, вызначыць іх уплыў на развіццё беларускага нацыянальнага руху.

У залежнасці ад палітычнай кан’юнктуры у развіцці палітычных узаемаадносін паміж урадам БНР і Літоўскай Тарыбай 1918–1923 гг. можна выдзяліць некалькі этапаў:

1) Лістапад 1918 – красавік 1919 г. – перыяд усталявання шчыльнага беларуска-літоўскага супрацоўніцтва. Многія беларускія дзеячы скіравалі свой позірк у бок Літвы, аддаўшы перавагу традыцыйнаму партнёру. Яны лічылі, што супрацоўніцтва з Літвой пасадзейнічае адраджэнню беларускай дзяржаўнасці і захаванню цэласнасці беларускіх зямель. Нацыянальныя лідары ў новых гістарычных умовах вярнуліся да ідэі стварэння літоўска-беларускай дзяржавы.

2) Май 1919 – ліпень 1920 г. – беларуска-літоўскія узаемаадносіны ў сувязі з складанай міжнароднай сітуацыяй звужаюцца, у іх вызначюцца шматлікія супярэчнасці. Літоўскі бок знізіў фінансаванне Міністэрства беларускіх спраў, недастаткова выпаўняліся ўмовы дамовы ад 27 лістапада 1918 г., што выклікала незадаволеннасць беларускіх нацыянальных дзеячоў. Кульмінацыяй стала падпісанне Літвой 12 ліпеня 1920 г. мірнага дагавора з Савецкай Расіяй. Дагавор беларускі бок не прызнаў і фактычна паўставала пытанне аб спыненні ўсякіх адносін з літоўскім бокам.

Репозиторий ВГУ

3) Жнівень 1920 – сакавік 1923 г. – адзін з найбольш плённых перыядаў ва ўзаемаадносінах паміж урадам БНР і літоўскай Тарыбай і дзейнасці Міністэрства беларускіх спраў. Безумоўна, таму паспрыяў заключаны 11 лістапада 1920 г. паміж урадамі БНР і Літвы дагавор аб супрацоўніцтве. Адбыліся чарговыя змены ў геапалітычнай сітуацыі ва Усходняй Еўропе восенню 1920 г., якія падштурхнулі літоўскіх палітыкаў ізноў шукаць шляхі да збліжэння. У сувязі з утварэннем Сярэдняй Літвы з боку Польшчы існавала рэальная пагроза літоўскай дзяржаўнасці, літоўцы не маглі змірыцца з такімі тэрытарыяльнымі стратамі і гэта стала новым стымулам для супрацоўніцтва літоўскага ўрада з беларускімі дзеячамі, згуртаванымі вакол В. Ластоўскага. Літоўскі бок разлічваў на падтрымку беларусаў у вырашэнні на сваю карысць Віленскага пытання.

У лістападзе 1918 г. ВБР, якая ўваходзіла ў Раду БНР, разам са сваім старшынёй распачала перагаворы з Літоўскай Тарыбай аб усталяванні шчыльнага супрацоўніцтва. Яны праходзілі 14, 20, 23, 26 і 27 лістапада і 8 снежня. 15 лістапада ВБР даслала ў Тарыбу асноўныя ўмовы дагавора, згодна з якімі беларускія прадстаўнікі маглі ўвайсці ў яе склад: 1) беларускім прадстаўнікам павінна быць адведзена 25% агульнага ліку месцаў у Тарыбе; 2) патрэбна стварыць міністэрства, калегію і сакратарыят беларускіх спраў; 3) на арганізацыю работы на беларускай тэрыторыі неабходна асігнаваць сумы, прапарцыянальныя колькасці насельніцтва [1, с. 296–297]. 27 лістапада ВБР даслала яшчэ адзін ліст у Тарыбу, у якім паведаміла аб згодзе прадстаўнікоў Беларусі ўвайсці ў яе склад і гатоўнасці прыняць удзел у стварэнні пры ёй Міністэрства беларускіх спраў [1, с. 299].

27 лістапада 1918 г. паміж ВБР і літоўцамі было заключана пагадненне аб супрацоўніцтве, на падставе якога беларусы далі згоду на далучэнне Віленшчыны ў склад Літоўскай Рэспублікі на правах аўтаноміі, літоўскі ўрад абавязваўся прызначаць службовых асоб на гэтай тэрыторыі толькі са згоды ўрада БНР і забяспечыць неабходныя ўмовы для развіцця на Віленшчыне беларускай культуры і адукацыі [4, с. 79]. У адпаведнасці з гэтай дамовай пры літоўскім урадзе 1 снежня 1918 г. паўстала Міністэрства беларускіх спраў на чале з Я. Воронка. У канцы лістапада 1918 г. у склад Тарыбы ўвайшло 6 сяброў Віленскай Беларускай Рады: В. Ластоўскі, І. Луцкевіч, Я. Станкевіч, В. Талочка, К. Фалькевіч і Д. Сямашка [5, с. 4]. Варта заўважыць, што 27 лістапада абодва бакі, якія дамаўляліся паміж сабой, не падпісалі канчатковага дакумента, таму перагаворы маглі лічыцца няскончанымі і пры неабходнасці працягнутымі. Акрамя таго перагаворы вялі заканадаўчыя ўлады. Ад літоўцаў перагаворы вяла не Тарыба, а ўрад. У сваю чаргу ВБР прапаноўвала літоўцам дамаўляцца толькі пасля таго, як атрымае паўнамоцтвы ад прэм'ера БНР А. Луцкевіча (які выконваў абавязкі старшыні ВБР).

У канцы 1918 пачатку 1919 г. беларусы імкнуліся пашырыць супрацоўніцтва з літоўцамі. 9–10 чэрвеня 1919 г. у Вільні быў скліканы

Рэпазіторый ВДУ

рэгіянальны беларускі кангрэс, які абвясціў сябе Беларускім з'ездам Віленшчыны і Гродзеншчыны. З'езд выказаў пажаданне аб дзяржаўным саюзе з Літвой, аб супрацоўніцтве па аднаўленні федэратыўнай беларуска-літоўскай дзяржавы, у якой кожная краіна мела б максімум незалежнасці і свабоды, заставалася б звязанай у палітычных і эканамічных адносінах. Разам з тым, дэлегаты ўказвалі, што нелітоўскія мясцовасці – Гродзенская і Віленская губерні – складаюць неад'емную частку Беларусі [7]. У Літве ў чэрвені 1919 г. было створана надзвычайнае прадстаўніцтва БНР на чале з П. Крэчэўскім, якому было даручана весці перамовы з літоўскім урадам. Перамовы з міністрам заграніччных спраў М. Сляжавічусам адбыліся 1, 7 і 14 чэрвеня. У чэрвені 1919 г. П. Крэчэўскі падаў літоўскаму ўраду дзве заявы, наконт становішча беларусаў і беларуска-літоўскага супрацоўніцтва, у якіх сцвярджалася: 1) літоўскі ўрад не правёў у жыццё першапачатковай умовы Віленскай Беларускай Рады з Тарыбай; 2) не разгледзеў праект упарадкавання адносін беларускай часткі да літоўскай; 3) літоўскі бок ігнаруе іншыя слушныя патрэбы беларускага боку [6, с. 123]. Перагаворы праходзілі вельмі складана. З боку літоўскага ўраду не было жадання знайсці які-небудзь кампраміс. "Аб Вільні, што яна этнаграфічна належыць Беларусі, і слухаць не хочуць, на супольную працу, каб зрабіць Вільню агульнай сталіцай з сумесным соймам не ідуць", – адзначаў П. Крэчэўскі ў данясенні ўраду БНР [6, с. 122]. Такі падыход літоўцаў выклікаў раздражненне ў беларускіх нацыянальных дзеячаў. В. Ластоўскі 27 чэрвеня 1919 г. адмовіўся ўдзельнічаць у працы камісіі па распрацоўцы закона аб выбарах ва Устаноўчы Сойм Літвы, аб чым паведаміў прадстаўнікам Літоўскай Тарыбы [3, с. 324].

Напрыканцы 1919–1920 гг. адносіны з літоўскім урадам усё больш пагаршаліся. Асноўныя праблемы ва ўзаемаадносінах узнікалі ў сувязі з разыходжаннямі адносна прыналежнасці зямель "гістарычнай Літвы" з цэнтрам у Вільні. У пачатку 1920 г. Я. Варонка некалькі разоў сустракаўся з прэзідэнтам літоўскай дзяржавы, але ніякага паразумення не было знойдзена. Кульмінацыяй крызісу ва ўзаемаадносінах было падпісанне 12 ліпеня 1920 г. савецка-літоўскага мірнага дагавора, згодна з якім Савецкі ўрад прызнаў самастойнасць і незалежнасць літоўскай дзяржавы, а Вільню і суседнія з ёй тэрыторыі (з Лідай і Гродна) – неад'емнай часткай Літвы .

Але ў сувязі з распачатым польска-літоўскім канфліктам, урад Літвы вырашыў пачаць перагаворы аб умацаванні супрацоўніцтва з урадам БНР, аб чым 27 кастрычніка 1920 г. праз пратаірэя І. Карчынскага афіцыйна паведаміў беларусаў. 30 кастрычніка 1920 г. В. Ластоўскі ўтварыў камісію па перагаворах і накіраваў "Дэкларацыю дэлегацыі БНР аб перагаворах з урадам Літоўскай Рэспублікі," у якой зазначалася, што беларускі ўрад пасылае ў Літву паўнамоцную дэлегацыю, якая павінна "дамовіцца з літоўскім урадам аб нашых умовах добрасуседскага жыцця і аб супольнай барацьбе ў абарону незалежнасці і непадзельнасці абодвух народаў" [6, с. 213].



Репозиторий ВГУ

Перагаворы праходзілі ў Коўна. Літоўскі бок прадстаўлялі П. Клімас, Б. Балтыс, В. Чарнецкая, С. Разембаўмас, Д. Сямашка і Ю. Шаўліс [2, с. 953]. 11 лістапада 1920 г. у ходзе перагавораў быў заключаны дагавор паміж БНР і Літоўскай Рэспублікай. Умовы дагавора прадугледжвалі палітычнае і вайсковае супрацоўніцтва, а менавіта: урад БНР абяцаў падтрымку жыхарамі – беларусамі Літвы – падчас плебісцыту, урад БНР згаджаўся на выкарыстанне яго вайсковых фарміраванняў урадам Літвы, урад Літвы прызнаваў урад БНР і даваў яму месца афіцыйнага побыту. Беларускі і літоўскі ўрады ўзаемна абавязаліся падтрымліваць адзін аднаго перад урадамі іншых дзяржаў. Пагранічнае пытанне паміж абедзвюма дзяржавамі павінна было вырашацца мірным шляхам пасля склікання Правамоцнага прадстаўнічага Збору БНР. Пытанні, якія датычыліся ўзаемаадносін паміж літоўскай і беларускай дзяржавамі, павінны былі вырашацца на аснове асобных дамоўленасцей [2, с. 954]. Дагавор быў падпісаны ў двух экземплярах на беларускай і літоўскай мовах і замацаваны дзяржаўнымі пячаткамі.

11 лістапада было таксама падпісана сакрэтнае пагадненне паміж двума ўрадамі "Аб узаемнай падтрымцы ў барацьбе за акупіраваныя Польшчай тэрыторыі", у якім былі вызначаны чатыры асноўныя напрамкі беларуска-літоўскага супрацоўніцтва [6, с. 215]. Згодна з ім, Рада БНР абавязвалася падтрымліваць у сваёй замежнай палітыцы права Літоўскай Рэспублікі на віленскую тэрыторыю ў межах, вызначаных расійска-літоўскім дагаворам ад 12 ліпеня 1920 г. Літоўскі бок абяцаў беларусам фінансавую падтрымку ў памеры не меней 1% бюджэта літоўскай дзяржавы. Працягвала сваю дзейнасць Міністэрства беларускіх спраў і беларускі асобны полк у складзе літоўскай арміі. Акрамя таго, беларускі бок пагадзіўся каардынаваць усе свае выступленні за мяжой з патрабаваннямі літоўскай палітыкі, падтрымліваць правы Літоўскай Рэспублікі на віленскую тэрыторыю, а літоўскі ўрад, са свайго боку, не парушаць правы беларусаў за мяжой і падтрымліваць беларускае пытанне перад урадамі Еўропы і Амерыкі. Такім чынам, урад В. Ластоўскага пайшоў на шэраг сур'ёзных палітычных кампрамісаў у пытанні аб тэрытарыяльнай цэласнасці і непадзельнасці БНР.

Урад БНР разгарнуў актыўную дзейнасць па выкананні ўмоў дагавора. На тыя сродкі, што ўрад БНР атрымаў ад Літвы, былі высланы дэлегацыі БНР у Лігу Нацый, у краіны Еўропы і ЗША. Прадстаўнікі БНР уручылі кіраўнікам гэтых краін, а таксама Лігі Нацый мемарандумы, у якіх гаварылася, што ўрад БНР лічыць за лепшае для Віленшчыны і Гродзеншчыны ўвайсці ў склад Літоўскай дэмакратычнай рэспублікі [4, с. 92]. Актыўную пазіцыю займаў урад БНР падчас польска-літоўскай канферэнцыі ў Бруселі, неаднаразова звяртаўся да яе кіраўніка П. Гіманса Але вырашыць канфлікт на карысць Літвы не ўдалося. 15 сакавіка 1923 г. Савет Лігі Нацый афіцыйна прызнаў усходнія граніцы Польшчы. У сувязі з гэтым адбыліся



Рэпазіторый ВДУ

змены ў адносінах паміж літоўскім урадам і ўрадам БНР, было спынена яго фінансаванне і згорнута дзейнасць Міністэрства беларускіх спраў. Пазіцыі БНР у Літве былі значна падарваны. Літва пасля Віленскага сейма не праявіла ніякай актыўнасці ў адносінах да беларусаў. Беларуска-літоўскія сувязі пачалі руйнавацца. Сітуацыю ўскладняў і раскол у беларускім нацыянал-дэмакратычным руху. Першапачатковая розніца ў поглядах на праблему знешнепалітычнай арыентацыі вылілася ў адкрытае супрацьстаянне з яўнымі спробамі дыскрэдытацыі палітычных апанентаў.


1. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі : У 2 кн. / Уклад., падрыхт. тэксту, уступ. арт, камент, пер., паказ. С. Шупы. – Вільня – Нью-Ёрк – Мінск – Прага : Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва : Т-ва бел. пісьменства “Наша ніва”, 1998. – Т. 1. – Кн. 1. – 860 с.
2. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі : У 2 кн. / Уклад., падрыхт. тэксту, уступ. арт, камент, пер., паказ. С. Шупы. – Вільня – Нью-Ёрк – Мінск – Прага : Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва : Т-ва бел. пісьменства “Наша ніва”, 1998. – Т. 1. – Кн. 2. – 1721 с.
3. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 4. т. / Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.– Мн. : Юніпак, 2008. – Т. 1.: 1 жніўня 1914 – 18 сакавіка 1921 гг. : у 2-х ч. Ч. 1.: 1 жніўня 1914 – 31 снежня 1919 гг. / [складальнікі: А. Ф. Вялікі і інш.]. – 537 с.
4. Багалейша, С. В. Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1915–1924 гг. / С. В. Багалейша. – Мінск : БДАТУ, 2014. – 232 с.
5. Засецкі, М. Міністэрства беларускіх спраў за 10 месяцаў існавання. Кароткі нарыс / М. Засецкі // Часопіс Міністэрства Беларускіх Спраў. – 1919. – № 1. – С. 3–9.
6. Знешняя палітыка Беларусі : зборнік дакументаў і матэрыялаў / Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь [і інш.]; [Склад.: У. М. Міхнюк, рэдкал.: І. І Антановіч (старшыня) і інш.]. – Т. 1. (1917–1922 гг.). – Мн. : БелНДІДАС : Выдавецкі цэнтр БДУ, 1997. – 395 с.
7. Родны край. – 1919. – 22 чэрвеня.


## ВЫДЗЯЛЕННЕ ЛАТГАЛЬСКІХ ПАВЕТАЎ СА СКЛАДУ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ

А. В. Бараноўскі (Мінск)

Латгалія – усходні гісторыка-культурны рэгіён Латвіі, размешчаны па правым беразе Даўгавы (Заходняй Дзвіны) ад ракі Айвіексце на захадзе да межаў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь на ўсходзе. У пачатку XX ст. яна ўваходзіла ў склад Віцебскай губерні і дзялілася на Дзвінскі, Люцынскі і Рэжыцкі паветы.

Паводле дадзеных першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. у Латгаліі пражывала 501623 чалавека. Самым населеным паветам быў Дзвінскі (сярэдняя шчыльнасць насельніцтва 61,4), найбольш рэдкім насельніцтва было ў Люцынскім павеце (27,86). Паводле

Рэпазіторый ВДУ